# ВАЛЯНЦІНА ЎЛАДЗІМІРАЎНА ЧАПКО – БЛАКАДНІЦА, ВЕТЭРАН ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ БССР БДУ

***В. С. Макарэвіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, makarevich.bsu.79@gmail.com*

На аснове архіўных матэрыялаў, а таксама атрыманых ад сваякоў матэрыялаў разглядаецца жыццёвы шлях у перыяд Вялікай Айчыннай вайны вядомага беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара, ў 1978–1983 гг. загадчыка кафедры гісторыі БССР гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Валянціны Ўладзіміраўны Чапко.

***Ключавыя словы:*** Валянціна Ўладзіміраўна Чапко; блакаднікі; удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны; гісторык; загадчык кафедры БДУ; доктар гістарычных навук.

# ВАЛЕНТИНА ВЛАДИМИРОВНА ЧЕПКО – БЛОКАДНИЦА, ВЕТЕРАН ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ, ЗАВЕДУЮЩИЙ КАФЕДРОЙ ИСТОРИИ БССР БГУ

***В. С. Макаревич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, makarevich.bsu.79@gmail.com*

На основе архивных материалов, а также полученных от родственников материалов рассматривается жизненный путь в период Великой Отечественной войны известного белорусского историка, доктора исторических наук, профессора, в 1978–1983 гг. заведующего кафедрой истории БССР исторического факультета Белорусского государственного университета Валентины Владимировны Чепко.

***Ключевые слова:*** Валентина Владимировна Чепко; блокадники; участники Великой Отечественной войны; историк; заведующий кафедрой БГУ; доктор исторических наук.

# BESIEGED LENINGRAD RESIDENT, VETERAN OF THE GREAT PATRIOTIC WAR, HEAD OF THE DEPARTMENT OF HISTORY OF THE BSSR OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY VALIANTINA CHAPKO

***V. Makarevich***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. Makarevich (makarevich.bsu.79@gmail.com)*

Based on archival materials, as well as materials received from the relatives, the famous Belarusian historian, doctor of historical Sciences, Professor and the head of the Department of history of the BSSR in 1978-1983 of the historical faculty of the Belarusian State University Valiantina Chapko life path during the Grate Patriotic war examines.

***Key words:*** Valiantina Chapko; blockaders; participants of the great Patriotic war; historian; head of the Department of BSU; doctor of historical Sciences.

Сярод выкладчыкаў і студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ нямала было выбітных асобаў, якія пакінулі след сваёй стараннай працы не толькі ў навуцы і на педагагічнай ніве. У час ліхалеццяў многія таксама адзначыліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, дзе набліжалі перамогу над нацызмам. Сярод плеяды гэтых людзей асобае месца нележыць доктару гістарычных навук, прафесару, загадчыку кафедры гісторыі БССР у 1978-1983 гг. Валянціне Ўладзіміраўне Чапко – вядомаму беларускаму гісторыку, markрознабаковаму і пытліваму даследчыку, які ўнёс вялікі ўклад у вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі, урбаністыкі канца XVIII – першай паловы XIX ст., жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны, у даследаванне і выданне дакументаў па гісторыі беларускай мінуўшчыны і гістарыяграфіі Беларусі. Валянціна Ўладзіміраўна зрабіла таксама вялікі ўклад у падрыхтоўку падручнікаў і іншых вучэбных матэрыялаў па айчыннай гісторыі.

Жыццё Валянціны Ўладзіміраўны было даволі доўгім і насычаным шчаслівымі і трагічнымі падзеямі. Успаміны пра яго знаходзім ў невялікім аўтабіяграфічным нарысе, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь [1]. Частка матэрыялаў захоўваецца таксама ў сямейным архіве дачкі Валянціны Ўладзіміраўны – Алены Леанідаўны Тарасевіч. Яна разам з Сяргеем Уладзіміравічам Жумарам у 2005-м годзе падрыхтавала пашыраную версію ўспамінаў маці да выдання ў «Беларускім археаграфічным штогодніку» [2, С.197–213]. Адзін з найбольш цікавых і драматычных перыядаў жыцця, пра які даволі падрабязна ўзгадвае Валянціна Васільеўна – гэта перыяд Вялікай Айчыннай вайны. На ім мы і спынімся у нашым артыкуле.

Нарадзілася Валянціна Ўладзіміраўна ў Мінску 25 лютага 1925 г. (па словах дачкі Валянціны Ўладзіміраўны ў рэчаіснасці датай нараджэння быў 1924 г.). Бацька быў міліцыянерам, маці – медычнай сястрой. Да пачатку вайны з-за пераводаў бацькі па службе сям'я шмат разоў пераязджала. Перад вайной сям'я жыла ў Віцебску, бзе бацька працаваў начальнікам гарадской міліцыі. Сярод дзіцячых успамінаў Валянціны Ўладзіміраўны – паездка ў пачатку 1930-х гадоў на адпачынак у Сочы па сямейнай пуцёўцы. Поезд ехаў праз галадаючую Ўкраіну. Дзяўчынцы запомніліся знясіленыя людзі, якія кідаліся да цягніка на кожным прыпынку з мальбамі аб кавалку хлеба. Бацька Валянціны Ўладзіміраўны тады раздаў усю ежу, якую яны бралі ў дарогу. У 1937-м яго незаконна абвінавацілі ў шпіянажы і выключылі з партыі. Не жадаючы быць арыштаваным і каб ўратаваць сям'ю, бацька застрэліўся. З гэтым звязаны яшчэ адзін жудасны эпізод успамінаў дзяцінства Валянціны Ўладзіміраўны. Вярнуўшыся у той дзень са школы, дванаццацігадовая Валянціна застала дома супрацоўнікаў НКУС, якія праводзілі вобшук. Ва ўспамінах яна піша, што так моцна крычала, што з роту і носу ішла кроў. Валянціну з мамай выселілі з кватэры ў паўпадвальнае памяшканне, дзе туліліся яшчэ дзве сям'і рэспрэсаваных з маленькімі дзецьмі. Не было дзе паставіць ложкі і маленькая Валя з маці спалі на куфары, прыставіўшы да яго крэслы. Па ўспамінах самой Валянціны Уладзіміраўны бацька пакінуў ёй ліст, які прачытала мама і перадала ёй змест: ён прасіў дачку быць сумленным чалавекам, вучыцца на выдатна,

сумленна працаваць, пісаў што калі-небудзь яна зразумее тое, што адбылося, пісаў што ні ў чым не вінаваты. Сам ліст забралі ў НКУС.

Скончыўшы школу з адзнакай, Валянціна Уладзіміраўна без экзаменаў паступіла ў Ленінградскі караблебудаўнічы інстытут на машынабудаўнічы факультэт. Пражывала ў інтэрнаце недалёка ад палаца Кшэсінскай. Насупраць была Петрапаўлаўская крэпасць, куды Валянціна часта хадзіла на экскурсіі, у выхадныя дні наведвала Эрмітаж, Рускі музей, Пецяргоф, Царскае Сяло, Паўлаўск, гуляла па Палацавай набярэжнай. Вучылася добра, першы семестр скончыла на “выдатна” і паехала ў Віцебск на вакацыі. Маці выйшла другі раз замуж за героя грамадзянскай вайны, кавалера Ордэна Чырвонага Сцяга Апановіча Уладзіміра Цімафеевіча, у якога жонка была арыштаваная і загінула дзесьці ў лагеры. Ён жыў з дзяўчынкай у двухпакаёвай добрай кватэры, куды і прыехала Валянціна і была сустрэтая з любоўю і айчымам і яго дачкой Галяй. Галя падчас адступлення Чырвонай Арміі ў пачатку вайны была санітаркай. Іх шпіталь трапіў у акружэнне пры набліжэнні нямецкіх войскаў да Віцебска і ўсе загінулі. Айчым быў прызначаны камандзірам батальёна, маці працавала ў шпіталі. Мама з айчымам спачатку былі ў адной частцы, потым айчым быў паранены і кантужаны, знаходзіўся на працяглым лячэнні. Маму ж Валянціны Ўладзіміраўны па яе ж просьбе накіравалі на Паўночна-Заходні фронт (бліжэй да Ленінграду, дзе яна спадзявалася знайсці дачку), але ў выніку адступлення войск апынулася ў шпіталі ў Разанскай вобласці, а затым пры фарміраванні новых армій стала працаваць старэйшай медсястрой шпіталя 27-й арміі. Айчым пасля выздараўлення не змог служыць у Дзеючай арміі і яго прызначылі намеснікам начальніка лагера ваеннапалонных. У 1943 г. мама была фельчарам 914-й асобнай роты сувязі 27-й арміі 2-га Украінскага фронту. Ёй было прысвоена званне лейтэнанта медыцынскай службы.

Працяглы час вайны Валянціна Ўладзіміраўна нічога не ведала ні пра маці, ні пра тое, дзе знаходзіўся дзядуля Панютич Макарый Навумовіч, які з сям'ёй і дзвюма дачкамі жыў да вайны ў Мінску.

Для Валянціны Ўладзіміраўны вайна пачалася так: 21 чэрвеня 1941 г. яна датэрмінова на «выдатна» здала апошні экзамен летняй сесіі, радасная ўзяла квіток у Віцебск на 22 чэрвеня. Хто мог ведаць, што гэта быў апошні мірны дзень. Раніцай Валянціна Уладзіміраўна адправілася за пакупкамі ва ўнівермаг. Там і пачула па радыё страшную вестку аб пачатку вайны. Цягнікі на поўдзень ужо не хадзілі, прыйшлося здаць білет. У панядзелак на агульным сходзе студэнтаў інстытута былі створаны студэнцкія атрады па будаўніцтву абарончых ўмацаванняў; многія дзяўчаты, у тым ліку і Валянціна Ўладзіміраўна, запісаліся на курсы медсясцёр ваеннага часу. Практыку праходзіла у былым Анічкавым палацы. Вельмі рана ў горадзе пачаліся бамбёжкі, палац хутка запоўніўся параненымі. У канцы чэрвеня студэнцкі атрад Валянціна Ўладзіміраўны накіравалі на будаўніцтва процітанкавых рвоў пад Усць-Лугай. Там ўпершыню Валянціна Ўладзіміраўна і яе калегі трапілі пад бамбёжку і артабстрэл. Яны пахаваліся па кустах, некаторыя пабеглі да вёскі, многія былі забітыя. Валянціна Ўладзіміраўна схавалася на ўскрайку лесу і да глыбокай ночы ляжала ў густым хмызняку, ядомая камарамі. У небе раўлі самалёты, ішла страляніна. Пасля яе заканчэння яна пабегла праз луг да вёскі, дзе засталіся савецкія танкі і машыны. Некаторых ацалелых будаўнікоў пасадзілі на грузавікі, якія накіроўваліся ў горад. Так, басанож, у парванай

сукенцы, брудная, яна вярнулася ў Ленінград. Потым такія «уцёкі» сталі звыклай справай. Аднойчы іх вывозілі на катэрах маракі, бо дарога была ўжо перарэзана немцамі. У верасні, капаючы эскарпы на Неўскай Дуброўцы, у бок будаўнікоў пачалося наступленне нямецкіх танкаў, і яны позна ўвечары беглі адтуль. Валянціна Ўладзіміраўна пешшу ўсю ноч ішла ў Ленінград, разбіла чаравікі, перасоўвалася босая. Месцамі амаль бегла, таму што за ўцекачамі, якіх было нямала, ляскалі танкі, чуліся стрэлы. Апісвае ў сваіх успамінах Валянціна Ўладзіміраўна і галоднае жыццё ў блакадным Ленінградзе.

2 лістапада 1941 г. падчас язды у трамваі ў інстытут у момант непрыяцельскага абстрэлу Валянціна Ўладзіміраўна была параненая недалёка ад гасціннага двара на вул. Садовай. Асколак снарада спыніўся зусім блізка ад сэрца ў целе дзяўчыны, трохі стрыманы доўгім каўнерам адзення і рамянём супрацьгазавай торбы, якая была пры дзяўчыне. Яна страціла прытомнасць. Даставілі Валянціну Ўладзіміраўну ў шпіталь для грамадзянскага насельніцтва, які размяшчаўся ў Анічкавым палацы, дзе да гэтага яна праходзіла двухмесячныя курсы медсясцёр ваеннага часу. Другога сакавіка 1942 г. адным з апошніх рэйсаў Валянціну, якая яшчэ была вельмі слабай, адправілі на Фінлянскі вакзал для эвакуацыі з горада, паколькі ёй не было куды выпісвацца (Караблебудаўнічы інстытут быў ужо эвакуіраваны ў г.Горкі). Пачалася блакада і ўсе цяжкасці і жахі, з гэтым звязаныя. Кранальныя факты і дакументы перыяда блакады Ленінграда, звязаныя з Валянцінай Уладзіміраўнай, нечакана выплылі на паверхню з тоўшчы гісторыі ў 2016 г. у Санкт-Пецярбурзе. У Дзяржаўным мемарыяльным музеі абароны і блакады Ленінграда была ўсталявана інсталяцыя «Памяць пакаленняў». У ёй быў змешчаны тэкст меню, напісаны лічыўшайся сярод загінуўшых 16-ці гадовай Валяй Чапко. Тэкст верагодна быў напісаны ў шпіталі і захаваны кімсьці з супрацоўнікаў:

«Меню после голодовки, если я останусь жива<br>
1-ые блюда:<br>
супа. Картофельный с грибами<br>
Овсяный<br>
Перловый<br>
Щи кислые с мясом<br>
2-ые блюда.<br>
каши: Овсяная с маслом<br>
Пшенная<br>
Перловая<br>
Гречневая<br>
Рисовая<br>
Манная<br>
Мясные блюда. Котлеты с пюре<br>
Сосиски с пюре<br>
или с кашей<br>
Об этом я и не мечтаю, т.к.<br>
до этого нам не дожить! »

У архіве музея высветлілася, што лісток з «Меню пасля галадоўкі» музею падарыла Ірына Ўладзіміраўна Асмінкіна – блакадніца 1938 г. нараджэння. Аднак інфармацыі пра тое, як гэты лісток да яе трапіў, няма.

Эвакуацыя з Ленінграда, пасля таго як Валянціна Ўладзіміраўна трохі паправілася, праходзіла на аўтобусе па лёдзе Ладажскага возера; потым чыгуначным эшалонам Валянціна Уладзіміраўна была эвакуяваная ў пас. Харовск у 100 кіламетрах на поўнач ад Волагды, дзе яе паўжывую знялі з цягніка. Урэзаліся ў памяць дзяўчыны бачаныя ёй горы трупаў пры выгрузцы з эшалона на ст. Волагда. У Хароўску Валянціна адразу апынулася ў чыгуначнай бальніцы, дзе да мая папраўляла здароўе пасля перанесенага ранення. У траўні была накіравана ў сяло Крестниковское Пустораменского сельсавета, ў 40 км. ад Харовска, дзе жыла ў доме адзінокай пажылой жанчыны і працавала ў калгасе. Голад быў страшэнны, ратавалі ягады, шчаўе, грыбы. Узімку 1942–43 г. Валянціне атрымалася ад аднакурсніцы даведацца адрас інстытута ў эвакуацыі і напісаць туды, адкуль яе ліст быў перанакіраваны маці, якая таксама шукала дачку. Убачыць почырк мамы было сапраўдным шчасцем для дзяўчыны, і гэта, як пісала Валянціна Ўладзіміраўна, складана перадаць словамі … . Мама па парадзе знаёмых са штаба фронту прапанавала дачцэ запісацца добраахвотнікам на фронт і прыехаць для праходжання службы ў яе 914-ю асобную тэлеграфна-будаўнічую роту. На Валянціну быў накіраваны запыт «накіраваць добраахвотніка-чырвонаармейца Чапко В. В., ленінградскую блакадніцу, ў вайсковую частку 03702 для праходжання сумеснай службы з маці». У кожнай камендатуры пасля чытання гэтых слоў Валянціну саджалі на першую ж машыну і накіроўвалі куды было трэба. На 12-ы дзень паездкі Валянціна апынулася пад Курскам, куды была перадыслакавана рота. Сустрэча з мамай была незабыўнай, бо яна думала, што дачка загінула. Усе байцы роты, а гэта былі 40-50-гадовыя будаўнікі-тэлеграфісты, рыдалі каля жанчын. Валя важыла ўсяго 35 кг. і усе мужчыны ў роце стараліся яе ўпотай падкормліваць. У роце Валянціна спачатку была тэлефаністкай, поварам, прачкай, потым стала старэйшым пісарам-справаводам роты, атрымала званне «сяржант», дапамагала маці аказваць медычную дапамогу параненым падчас абстрэлаў. Разам жанчыны прайшлі Курск, Белгарад, усю Украіну, Малдову, Бесарабію, Румынію, Венгрыю, Чэхаславакію, Аўстрыю, дзе 9 мая сустрэлі перамогу ў в. Пюрстэндорф. «Якая гэта была вялікая радасць !!» – пісала ў сваіх успамінах Валянціна Уладзіміраўна. Аднак вайна для жанчын на гэтым не скончылася. Рота была перадыслацыравана ў Манчжурыю, дзе ўдзельнічала ў баявых дзеяннях супраць Японіі. Вайна для Валянціны скончыласяу Чаньчуне.

Дэмабілізаваўшыся ў кастрычніку 1945 г., Валянціна паехала да дзядулі ў Мінск. Прыехаўшы 8 лістапада, звярнулася ў Міністэрства вышэйшай адукацыі. Хацела вучыцца. Здала іспыты і паступіла на 1-ы курс гістарычнага факультэта БДУ. На вучобу ў Ленінград яна вырашыла не вяртацца і засталася ў Мінску. Студэнткай 3-га курса яе ў першы раз абралі дэпутатам Мінскага гарадскога савета. Усяго ж Валянціна Уладзіміраўна была дэпутатам на працягу 12 гадоў, працавала ў камісіі па народнай адукацыі.

У 1950 г. Валянціна Ўладзіміраўна скончыла БДУ і паступіла ў аспірантуру, дзе вучылася да 1953 г. У 1954 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Общественная и культурная деятельность Георгия Скорины». Яе навуковым кіраўніком быў акадэмік У. М. Перцаў, па рэкамендацыі якога Валянціну Уладзіміраўну прынялі на працу ў Інстытут гісторыі АН БССР, дзе яна працавала да 1972 г. У 1956 г. стала старэйшым навуковым супрацоўнікам.

В. У. Чапко даследавала сацыяльна-эканамічныя працэсы ў Беларусі ў першай палове XIX ст., вывучала пытанні аграрнай гісторыі Беларусі, гісторыю беларускіх гарадоў канца XVIII–першай паловы XIX ст., творчасць Францыска Скарыны, гістарыяграфію Беларусі эпохі феадалізму, ўваходзіла ў склад аўтарскіх калектываў 2-томнай «Истории БССР», 5-томной «Гісторыі Беларускай ССР», падабрала, падрыхтавала і апублікавала дакументы для 3-га і 4-га тамоў зборніка «Белоруссия в эпоху феодализма».

Сабраны і прааналізаваны фактычны матэрыял лёг у аснову манаграфіі Валянцины Уладзіміраўны «Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в.», якая выйшла ў 1966 г. а ўжо праз тры гады В. Г.Чапко пры Інстытуце гісторыі АН БССР абараніла доктарскую дысертацыю на тэму «Разложение феодально-крепостнической системы и формирование капиталистических отношений в сельском хозяйстве Белоруссии в первой половине XIX века». У 1970 г. ўзнагароджана ордэнам Знак Пашаны. З 1972 па 1978 г. працавала загадчыцай кафедры ўсеагульнай гісторыі ў Мінскім педагагічным інстытуце ім. А. М. Горкага. У 1972 г. выдала манаграфію «Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX века». Працягвала займацца гісторыяй Сярэдніх вякоў: чытала агульны курс лекцый. 20 студзеня 1978 г. Валянціна Ўладзіміраўна напісала заяву на імя рэктара БДУ У. М. Сікорскага аб ўдзеле у конкурсе на замяшчэнне пасады загадчыка кафедры гісторыі БССР. З 1975 па 1983 г. загадвала кафедрай гісторыі БССР у БДУ. Адзначылася на гэтай пасадзе плённай навуковай працай, заслужыла вялікую павагу калег і аспірантаў, шмат дапамагала пры падрыхтоўцы навуковых работ. У 1976 г. Валянціне Ўладзіміраўне было прысвоена званне прафесара. У 1981 г. выйшла ў свет яе манаграфічнае даследаванне «Города Белоруссии в первой половине XIX века: экономическое развитие». У 1983 г. абставіны склаліся так, што Валянціна Ўладзіміраўна вымушана была пакінуць працу на кафедры гісторыі БССР і перайсці на кафедру гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў, дзе чытала курс па гісторыі Сярэдніх вякоў і спецкурс «Італьянскае Адраджэнне», кіравала курсавымі і дыпломнымі работамі.

Валянціна Уладзіміраўна была ўзнагароджана шэрагам узнагарод: ордэнам Айчыннай вайны 2-ой ступені, ордэнам Знак Пашаны, медалямі «За победу над Германией», «За победу над Японией», «За взятие Будапешта», «Ветеран труда», «Медаль Жукова» і шэрагам юбілейных медалёў. З’яўлялася аўтарам больш 150 публікацый. У Беларускім дзяржаўным універсітэце Валянціна Ўладзіміраўна Чапко працавала да сваёй смерці 23 лістапада 2004 г. Калектыў гістарычнага факультэта БДУ і кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу памятае Валянціну Ўладзіміраўну і ганарыцца заслугамі і подзвігам свайго настаўніка і калегі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 675 (В.Ў.Чапко). Воп. 1. Спр. 1–30.
2. Жумарь С.В., Тарасевич Е. Л. В. В. Чепко: из воспоминаний // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 6 / Рэд. калегія: У. К. Коршук (гал. рэд.) і інш. Мн.: БелНДІДАС, 2005. 364 с.